Наименование ТВП: Пойма Львы

© Козулин

Код: BY030

Географические координаты: 51°55' N 27°05' E

Административная принадлежность: Брестская область: Столинский район

Площадь: 17717 га

Критерии: A1, B2

Национальный природоохранный статус: не мае. Плануецца стварэнне ландшафтнага заказніка «Пойма Львы»

Международный природоохранный статус: ТВП міжнароднай значнасці

Общее описание:

Тэрыторыя ахоплівае паўночна-ўсходнюю частку буйнога леса-балотнага масіву ў бесейне ракі Льва. У 1970-1980 гады значныя плошчы забалочаных земляў па перыметры масіву былі асушаны і развораны, а ў цэнтральнай частцы пабудавана буйная гідрамеліярацыйная сістэма, што прывяло да моцнай антрапагеннай трансфармацыі прыродных комплексаў. Тым не меньш, тэрыторыя не страціла свайго значэння ў якасці рэзервата рэдкіх і пагражаемых відаў птушак. На

найменш трансфармаваным участку ў нізоўях ракі Льва на плошчы 3200 га, дзе выяўлена вялікая група ахоўваемых у Беларусі жывёл і раслін, мяркуецца стварыць ландшафтны заказнік. З поўдня да ўгоддзя прымыкае рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Альманскія балоты», які з’яўляецца адначасова ТВП і Рамсарскай тэрыторыяй.

Аснову раслінных фармацый складаюць лісцёвыя забалочаныя лясы, якія па пакатых градах замяшчаюцца хвойнікамі. Большая іх частка прама альбо ўскосна панесла страту ад меліярацыі і зараз істотна трансфармавана. Уздоўж рэчышча Львы прасягаюцца забалочаныя асаковыя, радзей разнатраўна-злакава-асаковыя поймавыя лугі і балоты.

Найбольш буйны вадацёк, рака Льва, працякае ў цэнтральнай частцы ўгоддзя. Рэчышча яе звілістае, месцамі ўтварае старыцы і затокі. Пакатыя берагі моцна забалочаны. Шырыня рэчышча 10-25 м, глыбіня 0,7-2 м. Балоты прадстаўлены ўсімі трыма тыпамі, дамінуюць поймавыя нізінныя балоты.

Раней на гэтай тэрыторыі знаходзіўся ваенны палігон і гаспадарчая дзейнасць практычна не вялася. У канцы 1990-ых гадоў землі былі перададзены Столінскаму лясгасу. Асноўная форма сучаснага выкарыстання тэрыторыі – вядзенне лясной гаспадаркі. На меліяраваных землях і часткова на натуральных поймавых лугах вядзецца сенакашэнне і выпас жывёлы. Жыхары навакольных населеных пунктаў займаюцца ва ўгоддзі паляваннем і рыбнай лоўляй.

Основные биотопы:

Лясы – 70%, сельска-гаспадарчыя ўгоддзі – 20%, балоты пераходныя –10%.

Птицы:

На ТВП адзначана гнездаванне глабальна пагражаемага віда драпежных птушак – вялікага арляца *Aquila clanga*. З ахоўваемых у Беларусі птушак тут гняздуюцца палявы лунь *Circus cyaneus*, арол-вужаед *Circaetus gallicus*, малы арлец *Aquila pomarina*, арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*. Ва ўгоддзі знойдзена некалькі такоў дубальта *Gallinago media*, даволі звычайныя чорны бусел *Ciconia nigra*, шэры журавель *Grus grus*, пугач *Bubo bubo*, вялікі грыцук *Limosa limosa*, беласпінны дзяцел *Dendrocopos leucotos*, белая блакітніца *Parus cyanus*.

Другие группы животных:

З занесеных у Чырвоную кнігу млекакормячых тут жывуць барсук *Meles meles* і арэшнікавая соня *Muscardinus avellanarius*, адзначаны перыядычныя заходы рысі *Lynx lynx*.

Колькасць капытных невысокая. З пушных звяроў толькі лісіца *Vulpes vulpes* і янотападобны сабака *Nyctereutes procyonoides* распаўсюджаны па тэрыторыі адносна раўнаважна. Астатнія віды сустракаюцца ў асноўным у больш багатых і прадуктыўных поймавых лясах. Рака Льва і старычныя азёры заселены бабром *Castor fiber* і андатрай *Ondatra zibethica*.

Герпетафауна ўключае 8 відаў земнаводных і 5 відаў паўзуноў. З ахоўваемых у Еўропе рэптылій адзначана балотная чарапаха *Emys orbicularis*.

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Черный аист *Ciconia nigra*	гн	+	2005-2010	П		
Орлан-белохвост *Haliaeetus albicilla*	гн	+	2005-2010	П		
Змееяд *Circaetus gallicus*	гн	+	2005-2010	П		
Лунь полевой *Circus cyaneus*	гн	9 п	2005-2010	Т		B2
Малый подорлик *Aquila pomarina*	гн	+	2005-2010	П		
Подорлик большой *Aquila clanga*	гн	5 п	2005-2010	Т	↔	A1

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды	Критерий ТВП
Журавль серый *Grus grus*	гн	+	2005-2010	П		
Веретенник большой *Limosa limosa*	гн	+	2005-2010	П		
Филин *Bubo bubo*	гн	+	2005-2010	П		
Дятел белоспинный *Dendrocopos leucotos*	гн	+	2005-2010	П		
Лазоревка белая *Cyanistes cyanus*	гн	+	2005-2010	П		

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Расліны: касач сібірскі *Iris sibirica*, пярэсна еўрапейская *Trollius europaeus*, асака ценявая *Carex umbrosa*, зубніца клубняносная *Dentaria bulbifera*, сон лугавы *Pulsatilla pratensis*, гарлачык белы *Nymphaea alba*.

Угрозы:

Асноўнымі неспрыяльнымі фактарамі, якія ўздзейнічаюць на натуральныя прыродныя супольніцтвы тэрыторыі, з’яўляюцца змяненні гідралагічнага рэжыму, пажары і высечкі лясоў.

Змяненні гідралагічнага рэжыму. Практычна ўсе балоты, якія прылягаюць да ляснога масіву з поўначы, асушаны і пераўтвораны ў польдэрныя сістэмы. Негатыўна адбілася на стане прыродных комплексаў і будаўніцтва гідрамеліярацыйнай пляцоўкі ў цэнтральнай частцы леса-балотнага масіву. Узровень грунтовых вод на ўчастках лясоў, прылягаючых да меліярацыйных сістэм, парушаны, што прыводзіць да іх дэградацыі.

Пажары на тэрыторыі леса-балотнага масіву з’яўляюцца вынікам асушэння прылягаючых зямель. У засушлівыя гады пажары ахопліваюць значныя тэрыторыі, што і адбылося ў 2002 годзе.

Высечкі лесу вядуцца без уліку прыродаахоўнай значнасці тэрыторрыі. У выніку скарачаюцца плошчы асабліва каштоўных старых шырокалісцёвых і хваёва-шырокалісцёвых лясоў, часта высякаюцца ўчасткі ў месцах гнездавання рэдкіх відаў драпежных птушак.

Рекомендации по сохранению:

Для захавання прыродных комплексаў угоддзя неабходна стварэнне рэспубліканскага ландшафтнага заказніка ў найбольш вартастным участку ляснога масіва, а на астатняй частцы тэрыторыі трэба ўзяць пад ахову месцы гнездавання вялікага арляца і іншых ахоўваемых відаў жывёл і раслін.

Источники информации:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Дамброўскі В.Ч., Жураўлёў Д.В., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М., Навіцкі Р.В.)

Составители : Дамброўскі В.Ч.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*